Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па вучэбнай рабоце
_________________ С.І.Васілец
«___» ____________2023 г.
Рэгістрацыйны № УД-___/вуч.
УД 26-1-№31-2023/уч.

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ
# (1861 – 1918 ГГ.)

Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасцей:
1-02 01 01 Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны;
1-02 01 02 Гісторыя і сусветная мастацкая культура;
1-02 01 03 Гісторыя і экскурсійна-краязнаўчая работа

2023 г.

Вучэбная праграма складзена на падставе тыпавой вучэбнай праграмы (____._____.202 г.) і вучэбных планаў спецыяльнасцей: 1-02 01 01 Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны; 1-02 01 02 Гісторыя і сусветная мастацкая культура;1-02 01 03 Гісторыя і экскурсійна-краязнаўчая работа

**СКЛАДАЛЬНІК:**
Л.Э. Дзічкоўская, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і славянскіх народаў БДПУ, кандыдат гістарычных навук

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
У.М. Кадзіра – першы прарэктар прыватнай установы адукацыі «Інстытут сучасных ведаў імя А.М. Шырокава», кандыдат гістарычных навук, дацэнт
В.А.Йоцюс – загадчык кафедры ўсеагульнай гісторыі і методыкі выкладання гісторыі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», кандыдат гістарычных навук

**УЗГОДНЕНА:**
Дырэктар дзяржаўнай установы адукацыі
«Гімназія № 40 імя Я.Лучыны г. Мінска» І.А.Бабкоў

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай гісторыі Беларусі і славянскіх народаў
(пратакол № 10 ад 21.03.2023).
Загадчык кафедры С.А.Талмачова

Навукова-метадычным саветам установы вышэйшай адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”
(пратакол № 5 ад 18. 04. 2023).

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджальных яе матэрыялаў дзеючым патрабаванням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае.

Метадыст
вучэбна-метадычнага аддзела БДПУ Г.В.Вінаградава

Дырэктар бібліятэкі Н.П.Сяткоўская

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Гісторыя Беларусі ўяўляе важную складовую частку славянскай, еўрапейскай і сусветнай цывілізацый і займае вядучае месца ў сістэме гуманітарнай падрыхтоўкі студэнцкай моладзі нашай краіны. Сваёй непаўторнай, гераічнай і трагічнай гісторыяй беларускі народ можа ганарыцца. Менавіта на гістарычных ведах фарміруецца нацыянальная свядомасць. Без ведаў сваёй гісторыі немагчыма будаваць сучаснае краіны і прагназаваць яе развіццё на будучае.

Вучэбная дысцыпліна “Гісторыя Беларусі (1861–1918 гг.)” грунтуецца на ведах, атрыманых пры вывучэнні наступных дысцыплін спецыяльнасці: “Гісторыя Расіі і Украіны (1861–1900 гг.)”, “Гісторыя Расіі і Украіны (1900–1917 гг.)”, “Культура Беларусі (XIX – пачатак XXI ст.)”, “Гісторыя Беларусі (канец XVIII ст.–сярэдзіна XIX ст.)”, “Эвалюцыя саслоўяў Беларусі”. Гэта дае магчымасць акцэнтаваць увагу студэнтаў на міждысцыплінарных сувязях, выявіць ролю і месца гісторыі этнасу Беларусі ў шырокім прасторавым і часавым дыяпазоне.

**Мэтай** вывучэння вучэбнай дысцыпліны “Гісторыя Беларусі (1861–1918 гг.)” з’яўляецца фарміраванне ў студэнтаў фундаментальных ведаў па гісторыі Беларусі 1861–1918 гг. і выхаванне на гэтай аснове пачуцця прыналежнасці да лёсу краіны і яе гісторыі.

Для рэалізацыі вызначанай мэты прадугледжваецца вырашэнне наступных **задач**:

– высветліць прычынна-выніковыя сувязі і заканамернасці гістарычнага развіцця беларускага народа ў кантэксце еўрапейскай і сусветнай гісторыі;

– садзейнічаць усведамленню студэнтамі сістэмы матэрыяльных, культурных і духоўных каштоўнасцей беларускага народа, якія служаць рэтраспектывай для аналізу сучаснасці і вызначэння перспектыў будучай жыццядзейнасці;

– забяспечыць атрыманне тэарэтычных і практычных ведаў, якія дазволяць студэнтам правільна аналізаваць падзеі і факты гісторыі, рабіць неабходныя высновы і абагульненні;

– спрыяць фарміраванню падрыхтаванасці выпускніка вышэйшай школы як грамадзяніна Рэспублікі Беларусь;

– стварыць неабходныя ўмовы для фарміравання ў студэнтаў пачуццяў прыналежнасці да гісторыка-культурнай спадчыны беларускага народа і адказнасці за яе захаванне;

– садзейнічаць ўсведамленню студэнтамі неабходнасці захавання дзяржаўнага суверэнітэту і выхаванню ў іх патрыятызму;

– з дапамогай вывучэння зместу вучэбнай дысцыпліны спрыяць фарміраванню ў студэнтаў навуковага светапогляду.

– сфарміраваць навукова катэгарыяльны і паняційны апарат па вучэбнай дысцыпліне.

– У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен **ведаць:**

– асноўныя падзеі і факты ў гісторыі Беларусі 1861–1918 гг. ;

– асаблівасці эканамічнага, сацыяльнага, палітычнага і культурнага развіцця Беларусі ў адзначаны перыяд;

– этапы фарміравання беларускай народнасці, развіцця традыцый беларускай дзяржаўнасці ў кантэксце дзяржаўнага будаўніцтва ў 1861–1918 гг.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен **умець:**

– выкарыстоўваць метадалогію гістарычнай навукі для аналізу гістарычнага развіцця беларускага народа;

– выяўляць асноўныя тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця края;

– выкарыстоўваць гістарычны вопыт для аналіза і ацэнкі сучасных праблем у развіцці Беларусі.

Увыніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен **валодаць:**

– спосабамі адбору і сістэматызацыі гістарычнай інфармацыі;

– метадамі, формамі і сродкамі аптымізацыі, рацыяналізацыі і інтэнсіфікацыі адукацыйнага працэсу.

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Гісторыя Беларусі (1861–1918 гг.)” павінна забяспечыць фарміраванне ў студэнтаў універсальных і базавых прафесійных кампетэнцый:

УК-9. Выяўляць фактары і механізмы гістарычнага развіцця, вызначаць грамадскае значэнне гістарычных падзей.

БПК-15. Выдзяляць асноўныя перыяды, тэндэнцыі і заканамернасці сацыяльных, эканамічных, палітычных, этна-нацыянальных, рэлігійна-канфесійных і культурных падзей і працэсаў, якія праходзілі на тэрыторыі Беларусі.

Пры вывучэнні кожнай тэмы студэнты павінны навучыцца карыстацца як канкрэтна-гістарычнымі (гісторыка-генетычным, гісторыка-параўнальным, гісторыка-тыпалагічным, гісторыка-сістэмным і інш.), так і агульнанавуковымі (індукцыі і дэдукцыі, аналізу і сінтэзу, узыходжання ад канкрэтнага да абстрактнага і наадварот, аналогіі і інш.) метадамі пазнання.

У рамках адукацыйнага працэсу па дадзенай вучэбнай дысцыпліне студэнт павінен набыць не толькі тэарэтычныя і практычныя веды, уменні і навыкі па спецыяльнасці, але і развіваць свой каштоўнасна-асобасны, духоўны патэнцыял, сфармаваць якасці патрыёта і грамадзяніна, гатовага да актыўнага ўдзелу ў эканамічным, вытворчым, сацыяльна-культурным і грамадскім жыцці краіны.

На вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Гісторыя Беларусі (1861–1918 гг.) ” па спецыяльнасцях 1-02 01 01 “Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны”, 1-02 01 02 “Гісторыя і сусветная мастацкая культура”, 1-02 01 03 “Гісторыя і экскурсійна-краязнаўчая работа” вучэбным планам адведзена ўсяго 108 гадзін (3 зал. адз.), з іх: аўдыторных – 54 гадзіны (22

гадзіны – лекцыйных заняткаў, 32 гадзіны – семінарскіх заняткаў, кіруемая самастойная работа – 6 гадзін: 2 гадзіны – лекцыі, 4 гадзіны – семінарскія заняткі), на самастойную работу – 54 гадзіны, экзамен у 5 семестры.

На завочнай форме атрымання адукацыі па спецыяльнасці 1-02 01 01 "Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны" вучэбным планам адведзена ўсяго 108 гадзін (3 зал. адз.): з іх аўдыторных – 14 гадзін (6 гадзін – лекцыйных заняткаў, 8 гадзін – семінарскіх заняткаў, экзамен на 3 курсе.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

**Раздзел 1 Беларусь у 1861–1900 гг.**

**Тэма 1.1 Буржуазныя рэформы. Асабліваці палітыкі царызму ў Беларусі ў 60 – 90-я гг. XIX ст.**

Гістарыяграфія пытання.Асноўныя тэрміны і паняцці. Адмена прыгоннага права. “Маніфест” і “Палажэнні” 19 лютага 1861 г. Спецыфіка мясцовых “Палажэнняў” для Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай, Мінскай губерняў. Сялянскае самакіраванне. Правы сялян. Умовы надзялення іх зямлёю. Часоваабавязанае становішча. Уздым сялянскага руху. Змены ў рэалізацыі рэформы, звязаныя з паўстаннем 1863 – 1864 гг. Рэформы аграрных адносін дзяржаўных сялян і іншых катэгорый сельскага насельніцтва. Вынікі і значэнне аграрных рэформ. Ваенная, земская, судовая, гарадская, цэнзурная, школьная рэформы.

“Контррэформы” 80 – 90-х гг. XIX ст. Вынікі і значэнне буржуазных рэформ. Асаблівасці палітыкі царызму ў Беларусі ў другой палове XIX ст. Асаблівасці развіцця сельскай гаспадаркі ў другой палове XIX ст. Развіццё прамысловасці ў Беларусі.

**Тэма 1.2 Паўстанне 1863–1864 гг. у Беларусі**

Гістарыяграфія пытання. Асноўныя тэрміны і паняцці. Паўстанне 1863–1864 гг. у Польшчы, Літве і Беларусі. Плыні ў кіраўніцтве паўстання. К.Каліноўскі. Літоўскі правінцыяльны камітэт (ЛПК). “Чырвоныя” і “белыя”. “Мужыцкая праўда”. Узаемаадносіны ЛПК і Варшаўскага Цэнтральнага камітэта. М.М. Мураўёў і яго дзейнасць у краі. Падаўленне паўстання. Вынікі і значэнне паўстання.

**Тэма 1.3 Станаўленне капіталістычных адносін ў сельскай гаспадарцы**

Усталяванне капіталізму ў сельскай гаспадарцы краін Заходняй Еўропы. Прускі і амерыканскі шляхі развіцця аграрнага капіталізму. Змены ў землеўладанні і землекарыстанні ў Беларусі ў 80–90-я гг. XIX ст. Рост буржуазнага землеўладання. Развіццё прадпрымальніцкай гаспадаркі. Аграрны крызіс 80-х гадоў XIX ст. і яго ўплыў на спецыялізацыю сельскай гаспадаркі Беларусі. Паглыбленне крызісу памешчыцкай гаспадаркі. Скарачэнне дваранскага землеўладання і рост бессаслоўнай зямельнай уласнасці. Галоўныя накірункі спецыялізацыі.

Падаткі і павіннасці сялян. Становішча сялянскай беднаты. Феадальна-прыгонніцкія перажыткі і іх уплыў на развіццё аграрнага капіталізму ў Беларусі. Фарміраванне аграрнай буржуазіі і сельскага пралетарыяту ў Беларусі.

**Тэма 1.4 Развіццё прамысловасці, транспарту і шляхоў зносін. Рост гарадоў**

Транспарт, гандаль і крэдыт. Будаўніцтва чыгунак. Дзейнасць банкаў у Беларусі. Абмежаванні ў адносінах да памешчыкаў “польскага паходжання”.

Развіццё прамысловасці і рост гарадоў. Спецыялізацыя беларускай прамысловасці. Яе галіновая структура. Высокая ўдзельная вага дробнай вытворчасці. Замаруджаныя тэмпы пераходу да машыннай вытворчасці (фабрыкі).

Прамысловае развіццё гарадоў і мястэчак. Прамысловасць у сельскай мясцовасці. Станаўленне фабрычнай вытворчасці Беларусі. Галіновая структура і размяшчэнне прамысловасці. Уплыў буржуазных рэформ і прамысловай рэвалюцыі на развіццё гарадоў Беларусі. Фарміраванне гандлёва-прамысловай буржуазіі і прамысловага пралетарыяту. Іх нацыянальны склад. Становішча прамысловых рабочых.

Колькасць, сацыяльны і нацыянальны склад буржуазіі Беларусі. Фарміраванне, структура і становішча рабочага класа Беларусі. Стварэнне фінансавых і крэдытных устаноў у Беларусі. Развіццё каапературнага руху. Колькасць, сацыяльны і нацыянальны склад гарадскога насельніцтва Беларусі ў 60-90-я гады XIX ст.

**Тэма 1.5 Пачатак узнікнення палітычных рухаў, партый, арганізацый**

Сялянскі і рабочы рух. Народніцкія гурткі ў Беларусі. Характар і асаблівасці народніцтва 80-90-х гадоў у Беларусі. Ідэйна-арганізацыйны крызіс народніцтва. Пачатак прапаганды марксізму ў Беларусі. Першыя сацыял-дэмакратычныя гурткі. I з’езд РСДРП. Утварэнне “Рабочага саюза Літвы” і Бунда. “Рабочая партыя палітычнага вызвалення Расіі”. Утварэнне сацыял-дэмакратыі Каралеўства Польскага і Літвы. Уздым рабочага руху ў другой палове 90-х гадоў. Асноўныя патрабаванні рабочых. Першыя палітычныя выступленні рабочых.

Перадумовы ўзнікнення палітычных партый і асаблівасці іх станаўлення ў Беларусі. Пачатак дзейнасці агульнарасійскіх партый і груповак. Узнікненне беларускіх партый і арганізацый.

**Тэма 1.6 Фарміраванне беларускай нацыі. Культура Беларусі ў другой палове XIX ст.**

Гістарыяграфія пытання. Гістарычныя ўмовы развіцця беларускай культуры ў другой палове XIX ст. і ўтварэнне беларускай нацыі. Этнічная тэрыторыя беларусаў, нацыянальны склад насельніцтва па губернях і паветах. Асаблівасці саслоўнага і рэлігійнага складу, заняткаў беларускага, рускага, польскага, яўрэйскага і татарскага насельніцтва Беларусі, яго размяшчэнне ў гарадах і сельскай мясцовасці. Развіццё капіталістычнага рынку. Паступовы распад саслоўнай структуры. Фарміраванне і нацыянальны склад пралетарыяту і буржуазіі. Слабасць эканамічных пазіцый беларускай нацыянальнай буржуазіі. Фарміраванне агульных нацыянальных прыкмет. Этнічная і нацыянальная самасвядомасць. Развіццё культуры Беларусі ў другой палове XIX ст. Школа і народная асвета.

Архітэктура, выяўленчае мастацтва ў другой палове XIX ст. Вывучэнне быту і матэрыяльнай культуры Беларусі. Этнаграфічныя і гістарычныя даследаванні. Музыка і тэатр. Горадабудаўніцтва і архітэктура. Жывапіс.

Вядучая роля гістарычнага жанру. Развіццё бытавога жанру, краявіду і партрэта. Шматнацыянальны характар культуры ў Беларусі.

Развіццё беларускай літаратуры ў другой палове XIX ст. Творчасць Ф. Багушэвіча, А. Гурыновіча, Я. Лучыны, К. Каганца і інш. Студэнцкія арганізацыі ў Пецярбургу і Маскве. Рост легальных публікацый на беларускай мове ў 90-я гады. Асаблівасці нацыянальна-культурнага руху. Школа іародная асвета. Пачатковая і сярэдняя адукацыя. Афіцыйны друк. Газета "Мінскі лісток". Прапаганда ідэалогіі "заходнерусізму". Беларускі фальклор. Быт і матэрыяльная культура, звычаі, абрады, нормы маралі народаў Беларусі.

**Раздзел 2 Беларусь у пачатку XX ст.**

**Тэма 2.1 Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў пачатку XX ст.**

Гістарыяграфія пытання. Развіццё капіталізму ў сельскай гаспадарцы. Феадальна-прыгонніцкія перажыткі. Эміграцыя. Капіталістычныя і прыгонніцкія формы эксплуатацыі. Сацыяльныя і нацыянальныя працэсы ў Беларусі да рэвалюцыі 1905–1907 гг. Сацыяльная структура насельніцтва. Эканамічная палітыка царызму ў Беларусі. Развіццё прамысловасці. Эканамічны крызіс 1900–1903 гг.. Структура і характар прамысловасці ў пачатку XX ст. Пранікненне буйнога капіталу. Прамысловыя таварыствы і іх роля ва ўмацаванні і цэнтралізацыі капіталу ў прамысловасці. Рост рабочага класа. Нацыянальны і сацыяльны склад рабочага класа Беларусі і яго становішча. Уздым рабочага і сялянскага руху.

Развіццё прамысловасці і гандлю. Транспарт і шляхі зносін. Сацыяльнае становішча рабочых: колькасць, склад, умовы працы. Памешчыцкае і сялянскае землеўладанне. Формы сялянскіх выступленняў. Дыферэнцыяцыя сялянства на мяжы XIX–XX стст.

**Тэма 2.2 Рэвалюцыя 1905–1907 гг. у Беларусі**

Гістарыяграфія пытання. Абвастрэнне сацыяльных супярэчнасцей і нацыянальнага пытання. "Паліцэйскі сацыялізм". Яўрэйская незалежная рабочая партыя. Сацыял-дэмакратычныя арганізацыі. Арганізацыя партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў і Польскай партыі сацыялістычнай у Літве. Беларускі нацыянальна-вызваленчы рух. Утварэнне Беларускай сацыялістычнай грамады. Пачатак рэвалюцыі: рэвалюцыйны рух у студзені – верасні 1905 г. Вяснова-летні ўздым палітычных выступленняў і эканамічнай барацьбы рабочых. Уплыў рабочага руху на сялянства. Новыя формы сялянскага руху. Салдацкія выступленні. Адносіны палітычных партый, насельніцтва Беларусі да ўказа аб скліканні Булыгінскай думы. Кастрычніцкая палітычная стачка ў гарадах і мястэчках Беларусі. Маніфест 17 кастрычніка 1905 г. Курлоўскі расстрэл у Мінску. Дыферэнцыяцыя грамадска-палітычных сіл. Буржуазна-ліберальны рух і яго асаблівасці ў заходніх губернях. Снежаньская палітычная стачка ў Беларусі. Адступленне рэвалюцыі.

Выбары і дзейнасць дэпутатаў ад Беларусі ў І Дзяржаўнай думе Расіі.

I-я Дзяржаўная дума ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі. Адступленне рэвалюцыі. Дзяржаўная дума другога склікання.

**Тэма 2.3 Сталыпінскія рэформы ў Беларусі і іх вынікі**

Палітычныя і ідэалагічныя ўмовы правядзення рэформ. Асаблівасці эканамічнай сітуацыі ў пяці заходніх губернях. Пераход надзельнай зямлі ва ўласнасць сялян. Арганізацыя перасялення сялян ў азіяцкую частку Расіі. Адыходніцтва. Земская рэформа ў Беларусі. Вынікі рэформ для Беларусі.

**Тэма 2.4 Культура Беларусі ў пачатку XX ст.**

Якасныя зрухі ў развіцці беларускай мастацкай літаратуры, нацыянальнай драматургіі, літаратурнай крытыкі і публіцыстыкі. Беларускія пісьменнікі: Я.Купала, Я.Колас, М.Багдановіч, Цётка, К.Каганец, Ц.Гартны, З.Бядуля, М.Гарэцкі. Асаблівасці беларускай літаратуры нашаніўскага перыяду. Развіццё перыядычнага друку і кнігадрукавання. Беларускія газеты. Беларускія выдавецтвы. Станаўленне беларускага прафесійнага тэатра. Развіццё і папулярызацыя беларускай народнай музыкі і песні. Драўлянае дойлідства. Жывапіс. Пераважнае развіццё жанру краявіду. Развіццё бытавога жанру. Разнастайнасць і супярэчлівасць выяўленчага мастацтва ў рэвалюцыйны час. Графіка. Пластыка і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Шматнацыянальны характар культуры Беларусі.

Нацыянальная палітыка. Барацьба з беларускім адраджэннем. Ідэалогія і практыка "заходне-русізму". Барацьба польскіх нацыяналістычных груповак з беларускім нацыянальным рухам. Газета "Наша Ніва" – цэнтр адраджэнцкага руху. Барацьба за адраджэнне і развіццё нацыянальнай мовы. Роля "Нашай Нівы" ў развіцці нацыянальнай літаратуры, друку, фарміраванні нацыянальнай беларускай інтэлігенцыі.

Адукацыя. Школьная справа ў Беларусі ў пачатку XX ст. Прафесійна-тэхнічнае навучанне. Стварэнне беларускай нацыянальнай школы. Арганізацыя падрыхтоўкі настаўніцкіх кадраў. Стварэнне падручнікаў для нацыянальнай школы. Навуковыя даследаванні мовы, этнаграфіі і гісторыі Беларусі.

**Раздзел 3 Беларусь у 1914 г. – пачатку 1918 г.**

**Тэма 3.1 Беларусь у гады Першай сусветнай вайны**

Гістарыяграфія пытання. Перадумовы і пачатак вайны. Увядзенне ваеннага становішча ў беларускіх губернях. Мабілізацыйныя мерапрыемствы. Адносіны да вайны розных слаёў насельніцтва, палітычных і грамадскіх арганізацый, газеты "Наша Ніва". Ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі ў 1915–1916 гг. Нямецкі акупацыйны рэжым. Дзейнасць "Беларускага камітэта дапамогі ахвярам вайны" на акупаванай тэрыторыі. Беларускае школьніцтва, культурна-асветніцкая справа ва ўмовах акупацыі ў 1915–1917 гг. Беларускі народны камітэт і Цэнтральны саюз беларускіх нацыянальных грамадскіх арганізацый. Стварэнне Беларускай сацыял-

дэмакратычнай рабочай групы. Заснаванне “Канфедэрацыі Вялікага Княства Літоўскага”.

**Тэма 3.2 Становішча Беларусі ў пачатку 1917 г.**

Гістарыяграфія пытання. Асноўныя тэрміны і паняцці. Асаблівасці эканамічнага, ваеннага і палітычнага становішча. Лютаўская рэвалюцыя ў Беларусі. Змены органаў улады. Стварэнне Часовых грамадскіх камітэтаў парадку, назначэнне камісараў Часовага ўрада, выбары валасных, гарадскіх і павятовых камітэтаў. Утварэнне Саветаў рабочых і сялянскіх дэпутатаў у Беларусі. Стварэнне салдацкіх камітэтаў у войсках Заходняга фронту і іх уплыў на становішча ў Беларусі. Першы з’езд ваенных і рабочых дэпутатаў арміі і тылу Заходняга фронту і яго адносіны да пытання аб вайне, да палітыкі Часовага ўрада. З’езды сялянскіх дэпутатаў, адносіны да ваеннага і аграрнага пытанняў.

Арганізацыя прафесійных саюзаў рабочых і служачых. Уздым грамадска-палітычнай актыўнасці насельніцтва Беларусі. Палітычныя партыі і грамадскія арганізацыі пасля падзення самадзяржаўя. Пазіцыі асноўных партый (кадэтаў, акцябрыстаў, сацыял-дэмакратаў, сацыялістаў-рэвалюцыянераў) па аграрным і нацыянальным пытаннях.

**Тэма 3.3 Беларускі нацыянальны рух пасля падзення самадзяржаўя**

Гістарыяграфія пытання. Асноўныя тэрміны і паняцці. Аднаўленне дзейнасці БСГ, яе арганізацый у гарадах Беларусі, Расіі, у арміі і на флоце. Канферэнцыя ў сакавіку 1917 г. Адносіны БСГ да Часовага ўрада, аўтаноміі Беларусі. Канферэнцыя БСГ у чэрвені 1917 г., абмеркаванне праекта новай праграмы БСГ, абранне часовага ЦК БСГ. З’езд прадстаўнікоў беларускіх нацыянальных арганізацый у Мінску 25–27 сакавіка 1917 г. Рашэнні з’езда па пытаннях аўтаноміі Беларусі, вызначэння яе тэрыторыі, арганізацыі культурна-асветніцкай работы. Утварэнне Беларускага нацыянальнага камітэта (БНК), яго склад і дзейнасць. Адносіны Часовага ўрада да набыцця Беларуссю аўтаноміі. З’езд прадстаўнікоў беларускіх партыйных і грамадскіх арганізацый 8–10 ліпеня 1917 г. Барацьба БСГ за лідэрства сярод беларускіх арганізацый. Абранне Цэнтральнай Рады беларускіх арганізацый (ЦРБА). Дзейнасць ЦРБА. III з’езд Беларускай сацыялістычнай Грамады. Прыняцце новай праграмы БСГ. II сесія ЦРБА, пераўтварэнне яе ў Вялікую Беларускую Раду (ВБР). Заснаванне Цэнтральнай беларускай вайсковай Рады (ЦБВР). Газета “Вольная Беларусь”. Стварэнне Беларускай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі, яе платформа. Беларускі абласны камітэт пры ўсерасійскім Савеце сялянскіх дэпутатаў (БАК).

**Тэма 3.4 Кастрычніцкая рэвалюцыя ў Беларусі**

Гістарыяграфія пытання. Рэвалюцыйныя падзеі ў Петраградзе і іх водгук на тэрыторыі Беларусі. Стварэнне ваенна-рэвалюцыйнага Камітэта (ВРК) Заходняй вобласці і фронту. Ліквідацыя органаў Часовага ўрада і арганізацыя савецкай улады на месцах. Барацьба за ўсталяванне савецкай

улады ў Мінску. Мінскі савет. Камітэт выратавання рэвалюцыі. Дапамога Заходняга фронту ва ўсталяванні савецкай улады ў Мінску. Усталяванне савецкай улады ў іншых гарадах Беларусі. Пазіцыя беларускіх нацыянальных партый да ўсталявання савецкай улады. Утварэнне Аблвыканкамзаха, стварэнне СНК Заходняй вобласці, савецкіх органаў кіравання на месцах. Першыя палітычныя, эканамічныя і сацыяльныя пераўтварэнні савецкай улады. Байкот мерапрыемстваў савецкай улады і барацьба з імі ВРК. Ажыццяўленне Дэкрэта аб міры на Заходнім фронце. Адносіны савецкай улады да нацыянальнага пытання і нацыянальнага руху ў Беларусі. Адкрыццё ўсебеларускага з’езда (кангрэса) у снежні 1917 г. Склад яго ўдзельнікаў, вызначэнне асноўных поглядаў на лёс Беларусі. Адносіны ўсебеларускага з’езда да ўлады Саветаў, мясцовых органаў савецкай улады. Разгон Усебеларускага кангрэса. Утварэнне Выканкама Ўсебеларускага з’езда.

**Тэма 3.5 Мяцеж корпуса І.Р.Доўбар-Мусніцкага. Наступленне Германіі**

Гістарыяграфія пытання. Палітычныя мэты мецяжу корпуса І.Р.Доўбар-Мусніцкага, яго тэрыторыя. Адносіны беларускага насельніцтва да польскіх легіянераў. Партызанская барацьба. Мерапрыемствы савецкай улады па падаўленні мецяжу. Ваенныя дзеянні супраць корпуса Доўбар-Мусніцкага. Сувязь польскіх легіянераў з нямецкімі войскамі. Наступленне нямецкіх войскаў у пачатку 1918 г. Захоп новых тэрыторый Беларусі. Спробы савецкай улады арганізаваць супраціўленне нямецкаму наступу. Вынікі Брэсцкага міру для Беларусі. Нямецкі акупацыйны рэжым на захопленай тэрыторыі Беларусі, адносіны да яго насельніцтва. Партызанская і падпольная барацьба супраць нямецкіх акупантаў у 1918 г. Заканчэнне Першай сусветнай вайны. Скасаванне Брэсцкага дагавору. Наступленне Чырвонай арміі, вызваленне тэрыторыі Беларусі ад нямецкіх войскаў. Беларускае пытанне падчас афармлення Версальскай сістэмы.

**Тэма 3.6 Беларуская Народная Рэспубліка**

Гістарыяграфія пытання. Прыняцце Выканкамам Усебеларускага з’езда Першай устаўной граматы. Стварэнне Народнага сакратарыята начале з І.Варонкам. Другая ўстаўная Грамата, яе змест. Абвяшчэнне Беларускай народнай рэспублікі (БНР). Рада БНР, яе склад і дзейнасць. Трэцяя ўстаўная Грамата, абвяшчэнне незалежнасці БНР. БНР і германскія ўлады. Палітычны крызіс БНР. Раскол у БСГ. Утварэнне Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (БСДП), Беларускай партыі сацыялістаў-федэралістаў (БПСФ), Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў. Пазіцыі беларускіх нацыянальных партый па сацыяльна-эканамічным, аграрным і нацыянальным пытанням. Барацьба за міжнароднае прызнанне БНР, адносіны да яе насельніцтва Беларусі і ўлады. Грамадска-палітычныя дзеячы беларускага адраджэнцкага руху.

**ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ**
**“Гісторыя Беларусі (1861–1918 гг. )” (дзённая форма атрымання адукацыі)**

| Нумар раздела, тэмы, занятку | Назва раздзела, тэма занятку, пералік пытанняў, якія вывучаюцца | Колькасць аўдыторных гадзін | | | Самастойная работа (пазааўдыторная) | Матэрыяльнае забеспячэнне занятку (нагляднья, метадычныя дапаможнікі і інш.) | Літаратура | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя (семінарскія) заняткі | Кіруемая самастойная работа студэнтаў | | | | |
| **5 семестр** | | | | | | | | |
| **1.** | **Раздзел. Беларусь у 1861–1900 гг.** | **10** | **12** | **2** | **22** | | | |
| 1.1 | **Буржуазныя рэформы. Асаблівасці палітыкі царызму ў Беларусі ў 60-90-я гг. XIX ст.**<br>1. Гістарыяграфія пытання пытання. Асноўныя тэрміны і паняцці.<br>2. Станаўленне буржуазнага грамадства ў Заходняй і Цэнтральнай Еўропе.<br>3. Агарарна-сялянскае пытанне ў Беларусі ў першай палове XIX ст. Прычыны адмены прыгоннага ладу.<br>4. Агульныя і мясцовыя “Палажэнн”і 19 лютага”. Асаблівасці адмены прыгоннага права ў Беларусі.<br>5. Сялянскі рух у час рэформы. Уплыў на рэалізацыю рэформы 19 лютага паўстання 1863 г.<br>6. Вынікі і значэнне аграрных рэформ. Феадальныя перажыткі, іх уплыў на становішча сялян і развіццё аграрных адносін у Беларусі. | 2 | | | 2 | Хрэстаматыя па гісторыі Беларусі, Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі | [1]<br>[2] | |
| | 1. Буржуазныя рэформы 70-80 гг. XIX ст.<br>2. Контррэформы 80-х гг. XIX ст. | | 2 | | 2 | | [1]<br>[2] | Вуснае апытанне |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 3. Вынікі і значэнне буржуазных рэформ.<br>4. Асаблівасці палітыкі царызму ў Беларусі ў другой палове XIX ст. | | | | | | | |
| 1.2 | **Паўстанне 1863–1864 гг. у Беларусі**<br>1. Асноўныя плыні ў польскім нацыянальна-вызваленчым руху. “Белыя” і “чырвоныя”.<br>2. Ідэйна-палітычныя пазіцыі К. Каліноўскага. “Мужыцкая праўда”.<br>3. Пачатак паўстання. Барацьба за кіраўніцтва. Тактыка паўстанцаў. Іх сацыяльны склад.<br>4. Прычыны паражэння паўстання і яго значэнне. | 2 | | | 4 | Прэзентацыя “Паўстанне 1863 – 1864 гг.” | [1]<br>[2] | |
| | 1. Гістарыяграфія пытання.<br>2. Ідэі, выказыныя К. Каліноўскім у “Мужыцкай праўдзе” і “Пісьме з-пад шыбеніцы”.<br>3. Палітыка царызму ў Беларусі ў сувязі з паўстаннем 1863 –1864 гг. | | 2 | | 2 | | [2] | Абарона прэзентацый |
| 1.3 | **Станаўленне капіталістычных адносін у сельскай гаспадарцы**<br>1. Усталяванне капіталізму ў сельскай гаспадарцы краін Заходняй Еўропы. Прускі і амерыканскі шляхі развіцця аграрнага капіталізму.<br>2. Змены ў землеўладанні і землекарыстанні ў Беларусі ў 60-90-я гг. Рост буржуазнага землеўладання.<br>3. Развіццё прадпрымальніцкай гаспадаркі. Аграрны крызіс 80-х гг. і яго ўплыў на спецыялізацыю сельскай гаспадаркі Беларусі. | 2 | | | 2 | Хрэстаматыя па гісторыі Беларусі, Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі | [1]<br>[2] | |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1. Падаткі і павіннасці сялян. Становішча сялянскай беднаты.<br>2. Феадальна-прыгонніцкія перажыткі і іх уплыў на развіццё аграрнага капіталізму ў Беларусі.<br>3. Фарміраванне аграрнай буржуазіі і сельскага пралетарыяту ў Беларусі. | | 2 | | | | | Даклады |
| 1.4 | **Развіццё прамысловасці, транспарту і шляхоў зносін. Рост гарадоў**<br>1. Станаўленне фабрычнай вытворчасці Беларусі. Галіновая структура і размяшчэнне прамысловасці.<br>2. Транспарт, гандаль і крэдыт, новыя сродкі сувязі.<br>3. Стварэнне фінансавых і крэдытных устаноў у Беларусі. Развіццё кааператыўнага руху.<br>4. Гарады і мястэчкі Беларусі ў 60-90-я гг. XIX ст.<br>5. Фарміраванне гандлёва-прамысловай буржуазіі і прамысловага пралетарыяту. Іх нацыянальны склад. | | | 2 (с) | 2 | Хрэстаматыя па гісторыі Беларусі, Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі | [1]<br>[2] | Прэзентацыі |
| 1.5 | **Пачатак узнікнення палітычных рухаў, партый, арганізацый**<br>1. Народніцтва ў Беларусі ў другой палове 60-х – 90-х гадоў: дынаміка, віды і формы барацьбы.<br>2. Перадумовы ўзнікнення палітычных партый і асаблівасці станаўлення апошніх у Беларусі.<br>3. Пачаткак дзейнасці агульнарасійскіх партый і груповак. | 2 | | | 2 | Табліцы, карты-схемы “Расійскія партыі ў пачатку XX ст.” | [1]<br>[2] | |
| | 1. Эвалюцыя народніцкага руху ў 60-90-я гг. XIX ст. на Беларусі.<br>2. Сацыял-дэмакратычны рух у Беларусі ў 80-90-я гг. XIX ст. Узнікненне палітычных партый.<br>3. Узнікненне беларускіх партый і арганізацый. | | 2 | | 2 | | [2] | Вуснае апытанне |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1.6 | **Фарміраванне беларускай нацыіі. Культура Беларусі ў другой палове XIX ст.**<br>1. Гістарыяграфія пытання. Асноўныя прыкметы этнасу. Перадумовы ператварэння народнасці ў нацыю. Этнічнае вызначэнне паняцця “нацыя”.<br>2. Гістарычныя ўмовы ўтварэння беларускай нацыі. Палітыка царызму ў нацыянальным пытанні.<br>3. Этнасацыяльныя працэсы ў Беларусі ў другой палове XIX ст. і іх уплыў на фарміраванне беларускай нацыі.<br>4. Развіццё навуковых ведаў пра Беларусь і беларусаў.<br>5. Станаўленне нацыянальнай самасвядомасці ў другой палове XIX ст.<br>6. Складанне агульнасці гаспадарчага жыцця. Асаблівасці рассялення, заняткаў, саслоўна-класавай структуры буржуазнага этнасу. | 2 | | | 2 | Хрэстаматыя па гісторыі Беларусі, Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі | [1]<br>[2] | Рэйтынгавая кантрольная работа № 1 |
| | 1. Развіццё культуры Беларусі ў другой палове XIX ст. Школа і народная асвета.<br>2. Развіццё беларускай літаратуры ў другой палове XIX ст.<br>3. Архітэктура, выяўленчае мастацтва ў другой палове XIX ст.<br>4. Развіццё навукі.<br>5. Вывучэнне быту і матэрыяльнай культуры Беларусі. | | 4 | | 2 | Хрэстаматыя па гісторыі Беларусі, Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі | [1]<br>[2] | |
| **2.** | **Беларусь у пачатку XX ст.** | **6** | **8** | | **18** | | | |
| 2.1 | **Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў пачатку XX ст.**<br>1. Гістарыяграфія праблемы развіцця эканомікі. Пытанні тэрміналогіі.<br>2. Развіццё капіталізму ў сельскай гаспадарцы. | 2 | | | 2 | Вучэбная карта “Прамысловасць і гарады Беларусі” | [1]<br>[2] | |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Сацыяльныя і нацыянальныя працэсы ў Беларусі.<br>3. Развіццё прамысловасці, яе структура.<br>4. Нацыянальны і сацыяльны склад рабочага класа, яго становішча.<br>5. Развіццё прамысловасці, яе структура.<br>6. Нацыянальны і сацыяльны склад рабочага класа, яго становішча.<br>7. Эканамічная і палітычная барацьба рабочых. | | | | | | | |
| | 1. Развіццё прамысловасці і гандлю. Транспарт і шляхі зносін.<br>2. Сацыяльнае становішча рабочых: колькасць, склад, умовы працы.<br>3. Памешчыцкае і сялянскае землеўладанне.<br>4. Формы сялянскіх выступленняў.<br>5. Разлажэнне сялянства на мяжы XIX-XX ст. | | 2 | | 2 | | [1]<br>[2] | Вуснае апытанне |
| 2.2 | **Рэвалюцыя 1905–1907 гг. у Беларусі**<br>1. Гістарыяграфія пытання. Пытанні тэрміналогіі.<br>2. Прычыны і пачатак рэвалюцыі.<br>3. Булыгінская Дума.<br>4. Кастрычніцкая палітычная стачка.<br>5. Снежаньскія падзеі 1905 г. у Беларусі.<br>6. Прычыны паражэння рэвалюцыі. | 2 | | | 4 | “Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі”.Т.2. | [1]<br>[2] | |
| | 1. Тры лагеры ў грамадска-палітычным руху.<br>2. Маніфест 17 кастрычніка. Курлоўскі растрэл.<br>3. Выбары і дзейнасць дэпутатаў ад Беларусі ў I і II Дзяржаўных думах.<br>4. І-я Дзяржаўная дума ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі. Адступленне рэвалюцыі.<br>5. Дзяржаўная дума другога склікання. | | 2 | | 2 | Табліцы: “Рэвалюцыя 1905 – 1907 гг”; дыяграмы, вучэбная карта: “Рэвалюцыя 1905 – 1907 гг. у Беларусі”. | [1]<br>[2] | Абарона паведамленняў |
| 2.3 | **Сталыпінскія рэформы ў Беларусі і іх вынікі**<br>1. Палітычныя і ідэалагічныя ўмовы правядзення | 2 | | | 2 | Карта: “Сталыпінскія | [1]<br>[2] | |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | рэформ.<br>2. Асаблівасці эканамічнай сітуацыі ў пяці заходніх губернях.<br>3. Скасаванне абшчыны пераход надзельнай зямлі ва ўласнасць сялян.<br>4. Арганізацыя перасялення сялян ў азіяцкую частку Расіі. Адыходніцтва.<br>5. Земская рэформа на Беларусі.<br>6. Вынікі рэформ для Беларусі. | | | | | рэформы ў Беларусі", табліцы, дыяграмы. "Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі".Т.3. | | |
| | 1. Гістарыяграфія пытання. Пытанні тэрміналогіі.<br>2. Значэнне ўвядзення земстваў у Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях.<br>3. Развіццё сельскай гаспадаркі Беларусі напярэдадні Першай сусветнай вайны.<br>4. П.А. Сталыпін. | | 2 | | 2 | | [1]<br>[2] | Вусныя адказы |
| 2.4 | **Культура Беларусі ў пачатку XX ст.**<br>1. Мастацкая літаратура ў Беларусі ў пачатку XX ст.<br>2. Адукацыя і народная асвета ў Беларусі ў пачатку XX ст.<br>3. Развіццё літаратуры і мастацтва.<br>4. Стварэнне беларускага друку і беларускіх выдавецтваў.<br>5. Газета "Наша Ніва" у барацьбе за нацыянальнае адраджэнне.<br>6. Беларускі тэатр у пачатку XX ст.<br>7. Навука ў пачатку XX ст. | | 2 | | 4 | Прэзентацыя | [1]<br>[2] | |
| **3** | **Беларусь у 1914 г. – пачатку 1918 г.** | **4** | **6** | **4** | **14** | | | Рэйтынгавая кантрольная работа № 2 |
| 3.1. | **Беларусь у гады Першай сусветнай вайны**<br>1. Пачатак Першай сусветнай вайны і стаўленне да яе ў Беларусі.<br>2. Ваенныя падзеі на тэрыторыі Беларусі ў | 2 | | | 2 | "Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі".Т.3. | [1]<br>[2] | |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1915–1916 гг.<br>3. Становішча на акупаванай тэрыторыі Беларусі.<br>4. Змены ў сацыяльна-эканамічным становішчы. | | | | | Карты. | | |
| | 1. Акупацыя германскімі войскамі Заходняй Беларусі.<br>2. Уплыў ваенных падзей на палітычнае і эканамічнае палажэнне ў Беларусі.<br>3. Беларускі нацыянальны рух у гада Першай сусветнай вайны.<br>4. Бежанства на Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны. | | 2 | | 2 | | [1]<br>[2] | Даклады |
| 3.2 | **Становішча Беларусі ў пачатку 1917 г.**<br>1. Асаблівасці сацыяльна-эканамічнага становішча Беларусі пасля Лютаўскай рэвалюцыі.<br>2. Органы кіравання Часовага Урада і Саветы ў Беларусі ў 1917 г.<br>3. Першы з’езд ваенных і рабочых дэпутатаў арміі і тылу Заходняга фронту.<br>4. З’езды сялянскіх дэпутатаў, адносіны да ваеннага і аграрнага пытанняў.<br>5. Палітычныя партыі і арганізацыі ў Беларусі пасля падзення самадзяржаўя. | | | 2(л) | 2 | “Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі”. Т.3.<br>Карты. | [1]<br>[2] | Прэзентацыі |
| 3.3 | **Беларускі нацыянальны рух пасля падзення самадзяржаўя**<br>1. Беларуская сацыялістычная грамада ў 1917 г.<br>2. З’езд прадстаўнікоў беларускіх нацыянальных арганізацый у Мінску 25–27 сакавіка 1917 г. Утварэнне БНК.<br>3. З’езд беларускіх нацыянальных арганізацый у ліпені 1917 г. Барацьба БСГ за лідэрства сярод беларускіх арганізацый.<br>4. Стварэнне Беларускай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі. Беларускі абласны камітэт пры | | 2 | | 2 | “Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі”. Т.3.<br>Карты. | [1]<br>[2] | Прэзентацыі |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | ўсерасійскім Савеце сялянскіх дэпутатаў (БАК). | | | | | | | |
| 3.4 | **Кастрычніцкая рэвалюцыя ў Беларусі**<br>1. Стварэнне сістэмы Савецкай ўлады ў Беларусі.<br>2. Першыя сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні савецкай улады.<br>3. Усебеларускі з’езд у снежні 1917 г. Утварэнне Выканкама ўсебеларускага з’езда. | 2 | | | 2 | “Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі”.Т.3<br>Карты. | [1]<br>[2] | |
| 3.5 | **Мяцеж польскага корпуса І.Р.Доўбар-Мусніцкага. Наступленне Германіі**<br>1. Палітычная мэта мецяжу І.Р.Доўбар-Мусніцкага.<br>2. Мерапрыемствы Савецкай улады па падаўленні паўстання.<br>3. Ваенныя дзеянні супраць корпуса Доўбар-Мусніцкага.<br>4. Наступленне нямецкіх войскаў у пачатку 1918 г.<br>5. Брэсцкі мір.<br>6. Значэнне Першай сусветнай вайны. Наступленне Чырвонай Арміі, вызваленне тэрыторыі Беларусі ад нямецкіх войскаў. | | | 2 (с) | 2 | | [1]<br>[2] | Абарона прэзентацый |
| 3.6 | **Беларуская Народная Рэспубліка**<br>1. Прыняцце Выканкамам Усебеларускага з’езда Першай устаўной граматы. Стварэнне Народнага Сакратарыята.<br>2. Другая ўстаўная грамата. Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі.<br>3. Рада БНР, яе склад і дзейнасць.<br>4. Трэцяя ўстаўная грамата, абвяшчэнне незалежнасці БНР.<br>5. Палітычны крызіс БНР. Раскол у БСГ.<br>6. Барацьба за міжнароднае прызнанне БНР, адносіны да яе беларускага насельніцтва. | | 2 | | 2 | | [1]<br>[2] | Рэйтынгавая кантрольная работа № 2 |
| | **Усяго** | **20** | **28** | **6** | **54** | | | **Экзамен** |

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ
## “Гісторыя Беларусі (1861 -1918 гг.)”

па спецыяльнасці 1-02 01 01 “Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны” (завочная форма атрымання адукацыі)

| Нумар раздела, тэмы, занятку | Назва раздзела, тэмы, занятку, пералік пытанняў, якія вывучаюцца | Колькасць аўдыторных гадзін | | Матэрыяльнае забеспячэнне занятку (нагляднія, метадычныя дапаможнікі і інш.) | Літаратура | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя (семінарскія) заняткі | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| **1.** | **Раздзел. Беларусь у 1861–1900 гг.** | **2** | **4** | | | |
| 1.1 | **Буржуазныя рэформы. Асаблівасці палітыкі царызму ў Беларусі ў 60-90-я гг. XIX ст.**<br>1. Гістарыяграфія пытання пытання. Асноўныя тэрміны і паняцці.<br>2. Станаўленне буржуазнага грамадства ў Заходняй і Цэнтральнай Еўропе.<br>3. Агарарна-сялянскае пытанне ў Беларусі ў першай палове XIX ст. Прычыны адмены прыгоннага ладу.<br>4. Агульныя і мясцовыя “Палажэнн”і 19 лютага”. Асаблівасці адмены прыгоннага права ў Беларусі.<br>5. Сялянскі рух у час рэформы. Уплыў на рэалізацыю рэформы 19 лютага паўстання 1863 г.<br>6. Вынікі і значэнне аграрных рэформ. Феадальныя перажыткі, іх уплыў на становішча сялян і развіццё аграрных адносін у Беларусі. | 2 | | | 2 | Хрэстаматыя па гісторыі Беларусі, Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1.2 | **Пачатак узнікнення палітычных рухаў, партый, арганізацый.**<br>1. Народніцтва ў Беларусі ў другой палове 60-х – 90-х гадоў: дынаміка, віды і формы барацьбы.<br>2. Перадумовы ўзнікнення палітычных партый і асаблівасці станаўлення апошніх у Беларусі.<br>3. Пачаткак дзейнасці агульнарасійскіх партый і груповак.<br>4. Узнікненне беларускіх партый і арганізацый. | | 2 | Табліцы, карты-схемы “Расійскія партыі ў пачатку XX ст.” | [1]<br>[2] | Прэзентацыі |
